


# КУЛЬГАН (КУЛЬГІН)
# АЛЯКСАНДР ГЕРАСІМАВІЧ



Нарадзіўся 12 сакавіка 1910 года ў вёсцы Загацце Талачынскага раёна Віцебскай вобласці.

У арміі з 1933 года. У званні малодшага камандзіра служыў у танкавых войсках. Удзельнічаў у Нацыянальна-рэвалюцыйнай вайне ў Іспаніі са снежня 1936 года па 1937 год у якасці танкіста рэспубліканскай арміі, якая змагалася з войскамі мяцежнага генерала Франка. Пасля вяртання з Іспаніі працягваў службу ў танкавых войсках Чырвонай Арміі. 16 жніўня 1937 года было прысвоена воінскае званне лейтэнант.

1941 год сустрэў у складзе 32-й танкавай дывізіі, сфарміраванай у 1938 годзе на базе 62-й танкавай брыгады. У прыгранічных цяжкіх баях у раёне Пружан і Брэста брыгада панесла вельмі вялікія страты і праз тыдзень была выведзена з бою і накіравана ў Маскоўскую акругу на папаўненне. Вызначыўся ў баях пад Масквой у званні маёра, быў камандзірам 27-га танкавага палка 62-й танкавай брыгады. Загінуў 9 ліпеня 1942 года (Расія). З баявога данясення: "У баі за Хрушчова загінуў камандзір 27-га танкавага батальёна маёр Кульган А.Г.".

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (04.07.1937г.), ордэнам Чырвонай Зоркі (02.01.1937г.).

Імя Кульгана Аляксандра Герасімавіча выбіта на гранітнай пліце воінскага мемарыяла ў Варонежы.

**Крыніцы інфармацыі:**

1. **Копылов, А.И.** 18-я гвардейская танковая бригада в боях за Родину 1942-1945 : люди, события, факты / Александр Копылов . – Москва 2021. – 712 с.

2. **Королёв, М.** Имя уроженца Толочинщины Александра Кульгана увековечено на гранитной плите в Воронеже / Михаил Королёв // Наша Талачыншчына. – 2020. – 23 декабря.

3. **Из Москвы – в страну "Икс".** Книга памяти советских добровольцев – участников Гражданской войны в Испании 1936-1939 гг. / сост. : В. Арцыбашев, О. Каримов, И. Волошенко; Главное архивное управление г. Москвы. Центральный гос. архив г. Москвы — Т. 1, 2. – Москва, 2015-2016 : ил., фото : [Электронный ресурс] : Режим доступа : lib.memo.ru›book/18444.

4. **Кульган Александр Герасимович.** – Галерея памяти участников ВОВ : "Дорога Памяти" : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : 1418museum.ru›heroes/42224556/

5. **Кульган Александр Герасимович.** – Люди и награждения : Подвиг народа : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://podvignaroda.ru

FREE-OFFICE.NET